# ГЛЫБОКАЯ АБ'ЯДНАЛЬНАЯ ФІЛАСОФІЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка 14 мая прыняў удзел у цырымоніі адкрыцця форуму «Адзін пояс і адзін шлях» у Пекіне. У гэты ж дзень беларускі Прэзідэнт разам з іншымі лідарамі дзяржаў, якія прыбылі на саміт, пабываў на прыёме ад імя Старшыні КНР Сі Цзіньпіна. Затым беларускі лідар наведаў святочны гала-канцэрт у Нацыянальным цэнтры выканальніцкіх мастацтваў.

Мерапрыемствы форуму «Адзін пояс і адзін шлях» працягнуліся ўчора. Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у пасяджэнні круглага стала кіраўнікоў дзяржаў — удзельніц саміту.

Выступаючы на гэтым мерапрыемстве, беларускі лідар адзначыў, што сёння свет знаходзіцца ў стадыі актыўнага развіцця і глабальных перамен. Змены спалучаны з беспрэцэдэнтнымі выклікамі і небяспекамі. «Менавіта таму сёння так важна выкарыстоўваць гістарычную магчымасць для змены мадэлі міждзяржаўнага ўзаемадзеяння. Дасягненне росквіту рэальнае толькі ў сумесным мірным ўзаемавыгадным развіцці», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт лічыць, што глабальныя ініцыятывы «Адзін пояс і адзін шлях» і «Супольнасць адзінага лёсу», вылучаныя кітайскім лідарам Сі Цзіньпінам, — гэта не проста ідэя эканамічнага партнёрства, а перш за ўсё глыбокая аб'яднальная філасофія міжнароднага супрацоўніцтва. «Пры рэалізацыі гэтых канцэпцый не адбываецца навязвання інтарэсаў, гандлёвай экспансіі ў дзяржавы. Кітай прыходзіць — і ў гэтым унікальная асаблівасць — як дружалюбная краіна, прапаноўваючы механізмы стымулявання сумеснага развіцця», — сказаў беларускі лідар.

Праект «Адзін пояс і адзін шлях» не толькі перакройвае эканамічную карту свету, стварае новыя пункты росту, але і фарміруе міжнародныя адносіны новага тыпу. Гэта інтэграцыя па-над блокамі, закліканая гарманізаваць усе эканамічныя інстытуты і прыбраць бар'еры на шляху свабоднага руху тавараў, інвестыцый і людзей. «Ганаруся тым, што Беларусь стала першай краінай у Еўропе і адной з першых краін у свеце, якія падключыліся да стварэння эканамічнага пояса Шаўковага шляху па цэлым шэрагу кірункаў», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Так, рэалізуючы прынцыпы пабудовы «Супольнасці адзінага лёсу», Беларусь і Кітай разам прасоўваюць праект індустрыяльнага парка «Вялікі камень». Ён будуецца як горад будучыні — экалагічны, інавацыйны і камфортны для працы і для жыцця. Глыбіня праекта ў тым, што дзве краіны сумесна ствараюць не толькі інфраструктуру, але і законы, па якіх развіваецца гэтая вузлавая пляцоўка эканамічнага пояса Шаўковага шляху.

«Яшчэ раз падкрэслю, што Беларусь з'яўляецца надзейным, адказным партнёрам Кітая. Пра гэта сведчыць устанаўленне асаблівага ўзроўню адносін паміж нашымі краінамі — усебаковага давернага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. Мы адкрытая краіна. Жыццёвы прынцып беларусаў — добрасуседства. Беларусь гатова да ўзаемадзеяння ў мэтах міжнароднага развіцця. Тут і цяпер мы павінны думаць аб сучасным пакаленні і несці адказнасць за нашых дзяцей і ўнукаў», — заклікаў кіраўнік беларускай дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ініцыятыва «Адзін пояс і адзін шлях» — гэта не проста гандлёвы маршрут, а канал руху ідэй і сумеснага стварэння інавацый. «Мы цалкам падтрымліваем думку, выказаную паважаным Старшынёй Сі Цзіньпінам, аб неабходнасці стварэння ўласных тэхналогій на аснове нацыянальных распрацовак і кіруемся заяўленым ім прынцыпам — «Нельга будаваць сваю будучыню на аснове мінулых чужых дасягненняў», — звярнуў увагу ён.

На палях форуму Аляксандр Лукашэнка меў шэраг міжнародных сустрэч, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. У першы дзень работы саміту кіраўнік дзяржавы правёў перагаворы з прэм'ер-міністрам Пакістана Навазам Шарыфам. Учора беларускі лідар сустрэўся з Прэзідэнтам Турцыі Рэджэпам Тайпам Эрдаганам. Кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі рэалізацыю дасягнутых раней дамоўленасцяў, а таксама перспектывы развіцця супрацоўніцтва паміж дзвюма краінамі ў розных сферах. У гэты ж дзень Прэзідэнт Беларусі правёў перагаворы з кіраўніцтвам шэрагу краін Афрыкі, Азіі, Еўропы і Лацінскай Амерыкі.

Аляксандр Лукашэнка сустрэўся таксама са старшынёй праўлення кампаніі «СІЦІК Груп» Чан Чжэньмінам. На сустрэчу таксама прыбылі кіраўнікі важнейшых падраздзяленняў карпарацыі. У 2007—2013 гадах кампанія рэалізавала ў Беларусі праект па будаўніцтве трох цэментных заводаў. Праз пару гадоў яна прыступіла да ўзвядзення аўтамабільнага завода «БелДжы» і шматфункцыянальнага комплексу на праспекце Пераможцаў у Мінску. Акрамя таго, у 2016 годзе прынята рашэнне стварыць у Беларусі новае прадпрыемства па вытворчасці спецыялізаваных робатаў, якія прымяняюцца для тушэння пажараў, правядзення падводных і горназдабыўных работ.

Прэзідэнт прапанаваў кіраўніцтву карпарацыі разгледзець розныя варыянты вядзення бізнесу ў Беларусі, разгарнуць які можна ў найбліжэйшы час. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўжо абмеркаваў гэтую сустрэчу са Старшынёй КНР і разлічвае на дасягненне канкрэтных дамоўленасцяў.

## За плячыма — людзі

**Орша і Аршанскі раён павінны атрымаць новы імпульс развіцця. Гэта адзначыла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА, прадстаўляючы актыву Аршанскага раёна новага старшыню райвыканкама Леаніда Пянькоўскага.**

Размаўляючы з журналістамі, Наталля Качанава адзначыла, што Орша і Аршанскі раён заўсёды былі значнымі і знакавымі тэрыторыямі як для Віцебскай вобласці, так і для краіны ў цэлым. «Гэта добры сельскагаспадарчы раён, буйны індустрыяльны цэнтр. Увага да Оршы прыцягнута нездарма, — сказала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Орша і раён павінны атрымаць новы імпульс развіцця, а веды і вопыт новага кіраўніка павінны быць рэалізаваны тут у поўнай меры. Дэпутацкі корпус і кіраўнікі ўсіх рангаў павінны выступіць адзінай камандай з новым старшынёй райвыканкама і рабіць усё, што неабходна для развіцця раёна».

«Прыемна, што сёння пра Леаніда Пянькоўскага добра казалі людзі, якія працавалі з ім у Бешанковіцкім раёне. Хацелася б, каб гэта прызначэнне было ўдалым, таму што Прэзідэнт надае самую пільную ўвагу кадрам, якія працуюць на месцах, — старшыням рай- і гарвыканкамаў. Бо гэта людзі, за плячыма якіх стаяць не проста тэрыторыі, а прамысловасць, сельская гаспадарка, сацыяльная сфера і, самае галоўнае, людзі з іх праблемамі і клопатамі. Гэта вельмі важна», — заявіла кіраўнік Адміністрацыі.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

## АДВАКАТЫ БЯСПЛАТНА ПРАКАНСУЛЬТУЮЦЬ ЛЮДЗЕЙ З ІНВАЛІДНАСЦЮ

**З 15 па 21 мая ў Беларусі праходзіць V Тыдзень даступнасці, арганізаваны «Офісам па правах людзей з інваліднасцю».**

Мэта гэтага комплексу мерапрыемстваў — павышэнне ўвагі да праблемы даступнасці для людзей з інваліднасцю з улікам Канвенцыі аб правах інвалідаў. Сёлета даступнасць разглядаецца ў першую чаргу ў фокусе свабоды ад дыскрымінацыі. Таму слоган мерапрыемства абазначаны наступным чынам — «Ад даступнасці да роўнасці».

Круглыя сталы, майстар-класы, публічныя лекцыі ад міжнародных экспертаў, тэматычныя кінапаказы... Сёлета не абыдзецца і без Форуму даступнасці, які будзе праходзіць у абноўленым фармаце. Кульмінацыяй мерапрыемства стане тэматычны фестываль у Лепелі.

У рамках Тыдня даступнасці па ўсёй краіне пройдуць і бясплатныя юрыдычныя кансультацыі для людзей з інваліднасцю. Кансультацыю змогуць атрымаць людзі з інваліднасцю I, II і III груп. Таксама могуць звяртацца сем'і, што выхоўваюць дзяцей з псіхафізічнымі асаблівасцямі, якія маюць інваліднасць.

Мінская гарадская калегія адвакатаў правядзе бясплатны прыём грамадзян з інваліднасцю 17—18 мая. У Мінскай вобласці акцыя пройдзе 16 мая, у Брэсцкай і Гомельскай — 17 мая, у Гродзенскай — 18 мая, у Віцебскай вобласці — 19 мая.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Меркель атрымала перамогу ў ключавой федэральнай зямлі

Чакаецца, што ХДС атрымае 34,5% галасоў у зямлі Паўночны Рэйн-Вестфалія, самай густанаселенай тэрыторыі Германіі, у той час як СДПГ прыйдзецца задавальняцца 30,5%. ХДС знаходзіўся ва ўладзе ў краіне практычна ўвесь пасляваенны перыяд. Гэтыя выбары разглядаліся як выпрабаванне на трываласць Ангелы Меркель, якой у верасні ісці на агульныя выбары.

### Нафта «пайшла на павышэнне»



Нафта маркі Brent адрэагавала рэзкім уздымам каціровак на заяву міністраў энергетыкі Расіі і Саудаўскай Аравіі. Аляксандр Новак і Халед аль-Фалех выступілі за падаўжэнне Венскага пагаднення па абмежаванні здабычы нафты краінамі АПЕК і дзяржавамі, якія не ўваходзяць у картэль, на дзевяць месяцаў — да канца сакавіка 2018 года. Кошт ф'ючарса на нафту маркі Brent з пастаўкай у ліпені 2017 года ў ходзе таргоў на біржы ICE у Лондане вырас на 2,6% — да $52,1 за барэль.

### У Емене — эпідэмія халеры

Улады ўвялі ў еменскай сталіцы Сане надзвычайнае становішча ў сувязі з успышкай халеры, з-за якой загінулі дзясяткі людзей. Міністэрства аховы здароўя краіны заклікала гуманітарныя арганізацыі дапамагчы ў барацьбе з эпідэміяй, каб пазбегнуць «беспрэцэдэнтнай катастрофы». Па звестках СААЗ, у раёнах, дзе высокая рызыка заражэння, пражывае каля 7,6 мільёна чалавек.

### Прэзідэнт Microsoft расказаў пра вінаватых у маштабнай кібератацы

Адказнасць за распаўсюджванне віруса-вымагальніка WannaCry часткова ляжыць на ўрадах і спецслужбах розных краін. Пра гэта прэзідэнт кампаніі Microsoft Брэд Сміт напісаў у сваім блогу. «Мы бачылі, што звесткі аб уразлівасцях, якія збірала ЦРУ, былі апублікаваныя на Wikileaks, цяпер жа звесткі аб уразлівасцях, скрадзеныя з АНБ (Агенцтва нацыянальнай бяспекі), закранулі карыстальнікаў па ўсім свеце», — заявіў Сміт. Як вядома, увечары 12 мая пачалі з'яўляцца паведамленні аб масавым заражэнні камп'ютараў праграмай-шыфравальшчыкам. Маштабная кібератака закранула больш за 200 тысяч карыстальнікаў у 150 краінах.

■ Тры пытанні да ўлады

# Калі ўсё сваё

## Як развіваецца глыбінка Палесся?



**Століншчына знаходзіцца даволі-такі далёка ад сталіцы, але па некаторых паказчыках мясцовыя жыхары нават выйграюць. У іх ліку, унікальная прырода і прыклад землякоў, якія паспяхова ладзяць свой бізнес у родных сёлах. Пра тое, чым жыве сёння Столінскі раён і якія мэты перад сабой ставіць на найбліжэйшы час, мы пагаварылі з Рыгорам ПРАТАСАВІЦКІМ, старшынёй Столінскага райвыканкама.**

***— Століншчына вядома як рэгіён з моцнай прадпрымальніцкай ініцыятывай, рэгіён добрых гаспадарнікаў. Як улады спрыяюць развіццю бізнесу?***

— Малы і сярэдні бізнес раёна прадстаўлены 229 суб'ектамі гаспадарання прыватнай формы ўласнасці, у іх ліку 44 фермерскія гаспадаркі. У форме індывідуальнага прадпрымальніцтва зарэгістравана 1 139 чалавек.

На Століншчыне паступальна ідзе развіццё фермерскіх гаспадарак. Фермерам выдзелена звыш дзвюх тысяч гектараў зямлі. Спецыялізацыя фермерскіх гаспадарак — агароднінцтва адкрытага і закрытага грунту. У апошнія гады інтэнсіўна развіваецца пладаводства, сёння «пад садамі» знаходзіцца 476 гектараў зямлі. Летась фермерскімі гаспадаркамі выраблена звыш 500 тон збожжа, 3,3 тысячы тон бульбы, каля 58 тысяч тон агародніны, 18 тысяч тон пладоў і ягад.

Неабходна адзначыць, што прыватны бізнес займаецца і перапрацоўкай сельскагаспадарчай прадукцыі. У фермерскай гаспадарцы «Альшаны» ўстаноўлена лінія па вытворчасці яблычнага соку. Прыватнае прадпрыемства «Палеская вострыя прыправы» займаецца саленнем і квашаннем агародніны.

Летась уведзены ў эксплуатацыю бізнес-цэнтр «Лілія», дзе цяпер функцыянуе дзевяць гандлёвых аб'ектаў. Гэты цэнтр пабудаваны з керамічнай цэглы, вырабленай, дарэчы, на Століншчыне — Гарынскім камбінатам будаўнічых матэрыялаў.

Адным з перспектыўных кірункаў у актывізацыі прадпрымальніцкай ініцыятывы ў нас бачыцца ўключэнне ў абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца. У 2016 годзе на адкрытых аўкцыённых таргах было прададзена дзевяць аб'ектаў, якія не выкарыстоўваюцца. Адзін аб'ект быў бязвыплатна перададзены для ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці маладым інвалідам. Сёлета быў прададзены яшчэ адзін аб'ект, дзе будзе створана сем рабочых месцаў.

***— На тэрыторыі раёна ёсць шмат цікавых, нават унікальных прыродных аб'ектаў. Якім чынам раён прыцягвае турыстаў? Што ўжо зроблена ў плане інфраструктуры?***

— Галоўным турыстычным брэндам нашага раёна з'яўляецца рэспубліканскі ландшафтны заказнік «Альманскія балоты» плошчай больш за 94 тысячы га. Гэта найбуйнейшы ў Еўропе комплекс верхавых, пераходных і нізінных балот, якія захаваліся да нашых дзён у натуральным выглядзе. У Альманскіх балотах пражывае 151 від птушак, 25 з іх занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Тут знаходзіцца найбуйнейшая ў лясной зоне Еўропы калонія шэрай чаплі. На тэрыторыі заказніка сустракаецца 26 відаў жывёл, тры з іх занесены ў Чырвоную кнігу.

У ландшафтным заказніку «Альманскія балоты» добраўпарадкавана экалагічная сцежка працягласцю 1,3 км да месца размяшчэння унікальных водна-балотных аб'ектаў: возера Вялікае Засамінае і Малое Засамінае (Мёртвае балота).

Што да самога Століна, то сапраўдным упрыгажэннем горада з'яўляецца сядзібна-паркавы ансамбль «Манькавічы» — былая рэзідэнцыя князёў Радзівілаў. Яшчэ адзін цікавы аб'ект — старадаўняя сядзіба «Нова-Беражное» вядомага княжацкага роду Алешаў (савецкі пісьменнік Юрый Алеша — яго нашчадак).

У раёне зарэгістравана 13 суб'ектаў аграэкатурызму (10 — фізічныя асобы, 3 — фермерскія гаспадаркі). Завяршаецца будаўніцтва аграсядзібы ў вёсцы Кашара паблізу заказніка «Альманскія балоты».

Што да інфраструктуры, то Беларуска-Германскім сумесным прадпрыемствам «Дамінік» у пойме Прыпяці ў маляўнічым месцы ўведзена ў эксплуатацыю турыстычная база з аказаннем паслуг рачнога сэрвісу на 36 месцаў.

***— Сёлета ў Давід-Гарадку плануюць правесці абласныя «Дажынкі». Што збіраецца абнавіць у горадзе напярэдадні знакавага мерапрыемства?***

— У цяперашні час праектнымі інстытутамі практычна завершана распрацоўка праектна-каштарыснай дакументацыі па 32 аб'ектах. З іх па аб'ектах адукацыі неабходна правесці капітальны рамонт з добраўпарадкаваннем сярэдніх школ №1 і №2, Цэнтра дзіцячай творчасці, стадыёна, ясляў-сада №1 па вуліцы Школьнай і бягучы рамонт дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы.

Акрамя гэтага, неабходна выканаць рэканструкцыю кінатэатра «Зара» — пад будынак клуба, рамонт помніка загінулым воінам на плошчы Вызвалення, капітальны рамонт музея і мадэрнізацыю цэнтральнай плошчы і сквера.

Па аб'ектах аховы здароўя патрабуюцца капітальны рамонт з мадэрнізацыяй і добраўпарадкаваннем адміністрацыйнага будынка і памяшкання хуткай дапамогі філіяла Давід-Гарадоцкай бальніцы па вуліцы Савецкай, рэканструкцыя гаражоў, капітальны рамонт з добраўпарадкаваннем Давід-Гарадоцкай бальніцы па вуліцы Кастрычніцкай, 81. Па аб'ектах інжынерна-транспартнай інфраструктуры прадугледжана добраўпарадкаванне шэрагу вуліц.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■